Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛЮТАГА 2017 г. СУБОТА № 29 (28393)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Што паглядзець замежніку ў Беларусі?

СТАР. 4



## Школьныя паборы: за і супраць

СТАР. 5



## Як ловяць «начных матылькоў»

СТАР. 13

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей АЎРАМЕНКА, першы намеснік міністра транспарту і камунікацый:**

*«Пытанне аб увядзенні платы за карыстанне аўтамабільнымі дарогамі для беларускіх уладальнікаў легкавых аўтамабіляў не разглядаецца, мы не плануем гэта рабіць. Таксама хачу сказаць аб выдаткоўванні сродкаў ад збірання дарожнага збору (летась яго сума склала $140 млн). Дзяржаўная пошліна размяркоўваецца і накіроўваецца на будаўніцтва, капітальны і бягучы рамонт рэспубліканскіх аўтадарог. У далейшым метад размеркавання дзяржпошліны можа быць удасканалены. Варта задумацца ў перспектыве аб размеркаванні пошлін у мясцовай дарожнай гаспадарцы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9028 | ▼ |
| Еўра | 2,0260 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0698 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЗНАЙДЗІЦЕ РОЗНІЦУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінскі інжынер-наладчык медыцынскіх лазерных апаратаў Андрэй НЕСЦЕРАЎ ужо болей за дзесяць гадоў захапляецца вывучэннем паводзін рэдкіх птушак, робіць іх здымкі. Для гэтага ён наведвае аддаленыя лясныя і балотныя біятопы краіны. Гэтым разам аматар-арнітолаг у ваколіцах заказніка Ельня прывабіў вераб'інага сыча — прадстаўніка самага маленькага віду савіных, які занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Для гэтага знаёмай майстрыхай быў выраблены — з воўны — штучны сычык. Дарэчы, на здымках вы бачыце іх абодвух. Знайдзіце розніцу!

■ Круглы стол

# ШТО БАЛІЦЬ ПАСЛЯ 60?

**Вось ён, сярэднестатыстычны мужчына «60 з плюсам», перажывае з-за таго, колькі яшчэ будзе працаваць, а здароўе ўжо, як правіла, дало збой, даводзіцца пайсці па ўрачах і атрымаць некалькі дыягназаў, працяглы пералік медыкаментаў і, безумоўна, моцны стрэс. Штосьці з пераліку пацыент пачынае прымаць, з'яўляюцца пабочныя эфекты, псіхалагічны стан пагаршаецца амаль да дэпрэсіі, і аднойчы — здароў, востры каранарны сіндром, інфаркт міякарда. Вывад? Не чакайце нейкай узроставай мяжы, каб заняцца здароўем. Ёсць хранічныя захворванні — шукайце ўрача-каардынатара, які будзе раіцца з вузкімі спецыялістамі, каб вы атрымалі як мага менш пабочных эфектаў ад лячэння. У ідэале такім спецыялістам стане ўрач агульнай практыкі.**

СТАР. 6–7




Фота Надзеі БУЖАН.

■ Дэкрэт №3

# Хто даказаў, што ён не ўтрыманец?

## Цяжарныя, выпускнікі і беларусы, якія ў 2015-м знаходзіліся за межамі краіны

**У спісах утрыманцаў апынулася шмат нечаканых людзей. Пра адных «забыліся» асобныя арганізацыі, не ўключыўшы іх у свае шэрагі. Іншых паспяшаліся прылічыць да абавязаных плаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў, бо на працу яны не ходзяць, а чаму — ніхто не разбіраўся. З 470 тысяч беларусаў, якія мусяць выплаціць дзяржаве грошы за ўтрыманскі лад жыцця, аддаць патрэбную суму пагадзіліся 44,5 тысячы чалавек, а гэта менш за 10%. Астатнія пакуль даказваюць, што нічога не вінны. Некаторым гэта ўдаецца.**

### Эмігрантка

— Шмат гадоў, жывучы ў Беларусі, я займалася пісьменніцкай дзейнасцю і супрацоўнічала з замежнымі рэдакцыямі. Падатковай інспекцыі я была нецікавая, бо падаткі за мяне выплачвалі мае партнёры з Расіі.

СТАР. 7